НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

УДК 821.161.3-3.09(043)

НАВАСЕЛЬЦАВА
Ганна Віктараўна

# МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ГІСТОРЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПРАЗАІКАЎ XX СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці
10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2013

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Бароўка Ванда Юльянаўна**, доктар філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры беларускай літаратуры УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Мальдзіс Адам Іосіфавіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, супрацоўнік ДУА «Інстытут культуры Беларусі» |
| | **Алейнік Лада Віктараўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| Апаніруючая арганізацыя: | **Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»** |

Абарона адбудзецца 20 сакавіка 2013 г. а ____ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (220072, Мінск, вул. Сурганава, 1 корп. 2, тэл.: 284-18-85, e-mail: inlinasbel@tut.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы                2013 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Д 01.42.04
кандыдат філалагічных навук                А.У. Бразгуноў

Актуальнасць даследавання мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі абумоўлена пастаяннай увагай з боку пісьменнікаў да айчыннага мінулага, неабходнасцю вызначэння далейшых шляхоў эстэтычнага ўвасаблення гісторыі ў літаратурным працэсе Беларусі пачатку XXI стагоддзя і асэнсавання ўплыву мастацкай інтэрпрэтацыі мінулага на фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці асобы. Праз вывучэнне эстэтычнага асваення пісьменнікамі гісторыі з асаблівай выразнасцю раскрываецца пранікненне сацыяльных і філасофскіх канцэпцый у літаратуру, узаемадзеянне гісторыі і мастацтва слова, сувязь грамадскай свядомасці і характару ўвасаблення мінулага. Наспеласць навуковага асэнсавання мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі вынікае з неабходнасці паглыбленага даследавання спадчыны беларускамоўных і рускамоўных пісьменнікаў Беларусі XX стагоддзя. Актуальнасць дадзенай працы вызначаецца яшчэ і тым, што многія творы на гістарычную тэму ўключаны ў тыпавую праграму «Гісторыя беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзя» для філфакаў ВНУ у якасці абавязковых для вывучэння.

Даследаванне мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творчасці празаікаў Беларусі XX стагоддзя сацыяльна запатрабавана. Яно паспрыяе паглыбленню агульнапрынятых уяўленняў пра ролю і месца айчыннага мінулага ў сістэме аксіялагічных прыярытэтаў сучаснага грамадства, пра шляхі нацыянальнага самапазнання беларусаў, пра суадносіны мастацтва слова і рэчаіснасці. Літаратура аказвае ўплыў на працэсы духоўна-маральнага развіцця грамадства, таму застаецца актуальным навуковае асэнсаванне эстэтычнага ўзнаўлення гісторыі як дзейснага сродку фарміравання патрыятызму, грамадзянскасці, культуры міжнацыянальных і міжасобасных зносін.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі.** Работа выканана на кафедры беларускай літаратуры УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» ў адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай фундаментальных даследаванняў «Даследаванне беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснага стану ў сувязі з іншымі славянскімі мовамі, распрацоўка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу (Беларуская мова і літаратура»)  у рамках праекта «Літаратура Віцебшчыны ў славянскім культурным кантэксце: гісторыя, сучаснасць, перспектывы» (2006–2010 гг., № дзярж. рэгістрацыі 20062120).

**Мэта і задачы даследавання. Мэта** дысертацыйнай працы заключаецца ў выяўленні праз шматаспектны аналіз спецыфікі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творчасці беларускіх празаікаў XX стагоддзя. Мэта даследавання патрабуе вырашэння наступных **задач**:

- ✓ абагульніць навуковыя ўяўленні пра мастацкую інтэрпрэтацыю гісторыі ў літаратуры;
- ✓ вылучыць дэтэрмінанты мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў беларускай прозе XX стагоддзя;
- ✓ выявіць генезіс і ахарактарызаваць дынаміку мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў айчыннай прозе XX стагоддзя;
- ✓ устанавіць праблемна-тэматычны і жанрава-стылёвы дыяпазон інтэрпрэтацыі гісторыі беларускімі празаікамі XX стагоддзя;
- ✓ выдзеліць атрыбутыўныя рысы мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творах беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя.

**Аб'ект і прадмет даследавання. Аб'ект** даследавання – творы беларускіх празаікаў XX стагоддзя пра мінулае, што прадстаўляюць асноўныя напрамкі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі. **Прадметам** даследавання абраны генезіс, этапы развіцця, праблемна-тэматычная і жанрава-стылёвая дынаміка мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў айчыннай прозе.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі – цэласна-інтуітыўнае, светапоглядна актыўнае спасціжэнне пісьменнікамі сэнсу гістарычных з'яў, прадстаўленае ў вобразнай форме, а таму полісемантычнае па сваёй сутнасці. Вылучаюцца тры асноўныя падыходы аўтараў да ўзнаўлення гістарычных рэалій: суб'ектыўна-творчы, аб'ектыўна-творчы, дакументальна-творчы.

2. Мастацкае ўвасабленне гісторыі ў беларускай прозе XX стагоддзя дэтэрмінавалася універсальнымі заканамернасцямі пазнання, сацыякультурнымі прычынамі (адраджэнскі рух пачатку стагоддзя; істотныя змены ў грамадскім жыцці, выкліканыя наступствамі рэвалюцый 1917 года і грамадзянскай вайны; Вялікай Айчыннай вайной; развіццём беларускай дзяржаўнасці; дынамікай прынятых у грамадскай свядомасці ўяўленняў пра суадносіны мінулага, сучаснасці і будучыні; назапашваннем эстэтычнага вопыту), асабістай зацікаўленасцю пісьменнікаў мінулым.

3. Пачатак мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі быў пакладзены ў творах даўняй беларускай літаратуры і ў прыгожым пісьменстве XIX стагоддзя. Станаўленне мастацкага асваення гісторыі прыпадае на першую палову XX стагоддзя, а развіццё – на другую палову мінулага стагоддзя.

4. У дынаміцы мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі на праблемна-тэматычным і жанрава-стылёвым узроўнях вылучаюцца некалькі этапаў. Айчынныя празаікі пачатку XX стагоддзя адлюстроўвалі галоўным чынам падзеі старажытнасці («Лірныя спевы» М. Гарэцкага, «Лабірынты» В. Ластоўскага), закраналі праблемы паходжання беларусаў («Прывід», «Беларускі радавод» В. Ластоўскага), лёсу іх культуры («Лабірынты», «Часы былі трывожныя» В. Ластоўскага), выкарыстоўвалі жанр апавядання. Аўтары

1920–1950-х гадоў пераважна ў жанры аповесці асвятлялі гісторыю з акцэнтаваннем сацыяльных калізій («Адвечнае» Б. Мікуліча, «Аповесць пра яснага Стахора» М. Садковіча і інш.), спарадычна звярталіся да паказу асоб, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё культуры Беларусі («Георгій Скарына» М. Садковіча і Я. Львова, «Ой, рана на Івана» З. Бандарынай і інш.). Празаікі 1960-х – сярэдзіны 1980-х гадоў вялікую ўвагу надавалі асэнсаванню найперш у жанрах аповесці і рамана ўзаемаадносін асобы і эпохі («Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча, «Кастусь Каліноўскі» А. Якімовіча, «Восень пасярод вясны» А. Мальдзіса, «Як агонь, як вада» А. Лойкі, «Загадка Багдановіча» М. Стральцова і інш.), аўтары канца стагоддзя галоўным чынам у жанрах рамана, аповесці, эсэ – пытанням станаўлення беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай самасвядомасці суайчыннікаў («Жалезныя жалуды» Л. Дайнекі, «Альгердава дзіда» В. Іпатавай, «Пабуджаныя», «Свой дом», «Кліч роднага звона» Г. Далідовіча і інш.).

5. Атрыбутыўныя рысы мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творах беларускіх празаікаў ХХ стагоддзя – паказ айчыннай гісторыі як арганічнай часткі сусветнай; акцэнтаванне патрыятычнага пафасу дзеля развіцця ў суайчыннікаў нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнага гонару і годнасці; адлюстраванне мінулага ў кантэксце духоўнай спадчыны беларусаў.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыйная праца выканана самастойна. Публікацыі па тэме даследавання напісаны без сааўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў вывучэнне гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі прайшлі апрабацыю на 14 навуковых канферэнцыях. У іх ліку: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя студэнтаў і маладых вучоных «Сацыяльна-псіхалагічныя і гуманітарныя аспекты інтэграцыі культур ва ўмовах трансфармацыі сучаснага грамадства» (Віцебск, 2005 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў «Садружнасць навук. Баранавічы-2005» (Баранавічы, 2005 г.); XIV Міжнародная навуковая канферэнцыя «Польска-беларускія культурныя, літаратурныя і моўныя сувязі» (Мінск, 2005 г.); XV, XVI, XVII Гарэцкія чытанні, прысвечаныя Максіму і Гаўрылу Гарэцкім (Мінск, 2007, 2008, 2009 гг.); XVI, XVII Міжнародныя навуковыя канферэнцыі «Мова і культура» імя праф. С. Бурагі (Кіеў, 2007, 2008 гг.); Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы з гістарычнага мінулага і сучаснасці ў грамадска-гуманітарных і сацыя-рэлігіязнаўчых навуках Беларусі, блізкага і далёкага замежжа» (Віцебск, 2007 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у еўрапейскім кантэксце» (Мінск, 2008 г.); VII рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні (Брэст, 2009 г.); Рэспубліканская навуковая

канферэнцыя «Творчасць Івана Навуменкі: славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст (да 85-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі акадэміка І.Я. Навуменкі)» (Мінск, 2010 г.); XV (62) Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя «Навука – адукацыі, вытворчасці, эканоміцы», прысвечаная 100-годдзю з дня заснавання УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» (Віцебск, 2010 г.); Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце» (Віцебск, 2010 г.).

Пра апрабацыю вынікаў сведчаць дыпломы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь аб прысуджэнні першай катэгорыі (2004 г.) і звання лаўрэата (2006 г.) на конкурсах навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 26 публікацыях, сярод якіх 14 артыкулаў (з іх 12 надрукаваны ў рэкамендаваных ВАК навуковых часопісах), 11 матэрыялаў канферэнцый, 1 манаграфія. Агульны аб’ём публікацый па тэме дысертацыі, якія адпавядаюць пункту 18 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь», складае 6,7 аўтарскага аркуша; агульны аб’ём іншых публікацый (манаграфіі, артыкулаў у навуковых зборніках, матэрыялаў дакладаў на навуковых канферэнцыях) – 9,5 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (284 адзінкі, з іх спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 258 адзінак, спіс публікацый саіскальніка – 26 адзінак) і дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі – 130 старонак, асноўны тэкст даследавання займае 105 старонак, бібліяграфічны спіс – 21 старонку, дадаткі – 4 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва «**Уводзінах**» абгрунтоўваюцца выбар тэмы, яе актуальнасць і значнасць. Удакладняецца, што пад гісторыяй дысертант мае на ўвазе аддаленыя ў часе, працэсуальна завершаныя падзеі ці грамадскія з’явы. Пачатак асэнсаванню мастацкага ўвасаблення гісторыі быў пакладзены ў трактаце Арыстоцеля «Аб мастацтве паэзіі». Каштоўныя заўвагі пра спецыфіку мастацкага ўзнаўлення гістарычнай рэчаіснасці пакінулі Г.В.Ф. Гегель, В.Р. Бялінскі, Г. Лукач, Э. Штайгер, М.М. Бахцін, Г.М. Ленобль, Б.А. Успенскі, Ю.Б. Бораў, П. Рыкёр. Праблемы мастацкага асэнсавання мінулага глыбока даследаваліся ў працах Л.П. Аляксандравай, А.Г. Баканава, І.П. Варфаламеева, І.П. Горскага, А.І. Паўткіна, С.М. Пятрова, Ю.М. Тынянава. Сучаснае айчыннае

(працы Л.І. Прашковіч, Д.Я. Бугаёва, А.Л. Вераб'я, А.У. Русецкага, І.І. Дамарад, А.П. Дарагакупец, Т.М. Камароўскай, В.К. Шынкарэнкі і інш.) і замежнае літаратуразнаўства (П. Гамара, Б. Бленкман, Д. Віяр, А. Холдэр, К. Страўт і інш.) вывучае працэсы ўзаемадзеяння літаратуры і гісторыі з улікам напрацовак культурна-гістарычнай школы, міфапаэтыкі, псіхааналітызму, герменеўтыкі, рэцэптыўнай эстэтыкі, нараталогіі. У нацыянальным літаратуразнаўстве да апошняга часу не было шматаспектнага канцэптуальна-сістэмнага даследавання мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі на матэрыяле твораў не толькі беларускамоўных, але і рускамоўных аўтараў, а гэта ў пэўнай ступені рэдукавала карціну мастацкага асваення мінулага нацыянальнай літаратурай.

У першым раздзеле **«Спецыфіка мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі»** сцвярджаецца, што літаратура – важны сродак захавання памяці пра мінулае. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі мае на мэце спасціжэнне і ацэнку сутнасці падзей і асоб, адлюстраванне мінулага, якое ўвасабляецца не толькі ў сваіх уласных межах, але і з перспектывай на далейшае развіццё, дае адказы на актуальныя пытанні таго часу, у які працуе аўтар. У выніку гэтага гістарычныя факты падаюцца ў адпаведнасці з аўтарскім уяўленнем пра мінулае. Распаўсюджанае меркаванне пра антынамічнасць мастацкай і навуковай інтэрпрэтацыі гісторыі не адпавядае сапраўднасці, бо суб'ектыўнасць у адборы фактаў дзеля падмацавання свайго пункту погляду ўласціва не толькі пісьменніку, але і гісторыку. Так, ацэнка паўстання 1863–1864 гадоў і дзейнасці Кастуся Каліноўскага ў працах польскіх і беларускіх навукоўцаў не заўсёды супадае. Пры гэтым кожны з бакоў спасылаецца на дакументы дзеля аргументацыі свайго пункту гледжання. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі ажыццяўляецца ў вобразнай форме, таму вобраз гістарычнай асобы ці падзеі ў прыгожым пісьменстве трансфармаваны, згушчаны, сэнсава завостраны.

Увасабленне мінулага ініцыятыўнае ў плане выбару аўтарам гістарычнага перыяду і персаналій. Мастацкі гістарызм як асваенне пісьменнікам канкрэтна-гістарычнага зместу той або іншай эпохі – важны складнік інтэрпрэтацыі мінулага ў літаратурным творы. У імпліцытнай форме мастацкі гістарызм выступае неад'емнай якасцю любога літаратурнага твора, таму што гэта перш за ўсё адлюстраванне галоўных тэндэнцый грамадскага развіцця, якія выяўляюцца і ў гістарычных падзеях, і ў прыватным чалавечым лёсе. А ў эксплiцытнай – гістарычны каларыт, уключэнне ў твор пазнавальных рэалій канкрэтнага часу. Непасрэднае ўвасабленне гістарычнага каларыту дэтэрмінуецца пісьменніцкім разуменнем мінулага, выбраным жанрам. Так, у гісторыка-прыгодніцкай прозе не абавязковыя падрабязныя апісанні гістарычных рэалій, там яны носяць пераважна дэкаратыўны характар, у гісторыка-філасофскай – яны галоўным чынам лаканічныя, у сацыяльна-

бытавых жа творах – нярэдка разгорнутыя і надзвычай важныя для разумення часу і характару персанажаў.

Аснова мастацкай інтэрпрэтацыі гістарычнай рэчаіснасці – спалучэнне фактаў з пісьменніцкім вымыслам. Выкарыстанне фактаў робіць твор гістарычным, а зварот да вымыслу надае пэўныя мастацкія вартасці. Можна вылучыць тры асноўныя пісьменніцкія падыходы да эстэтычнага асваення мінулага: аб'ектыўна-творчы, калі ў аснову напісанага пакладзены рэальныя гістарычныя падзеі, у якасці галоўнага героя выступае гістарычная асоба, наглядаецца пэўная раўнавага паміж фактам і вымыслам («Кастусь Каліноўскі» А. Якімовіча, «Крыж міласэрнасці» В. Коўтун і інш.); суб'ектыўна-гістарычны – калі аўтар расказвае пра сапраўдныя гістарычныя падзеі, галоўным героем з'яўляецца выдуманая асоба, а рэальныя гістарычныя персанажы пададзены эпізадычна ці адсутнічаюць; прэвалюе мастацкі вымысел над фактам, аднак пераканаўча перададзены дух часу («Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіча, «За морам Хвалынскім» В. Іпатавай і інш.); дакументальна-творчы – калі дакумент пераважае над мастацкім вымыслам, а аўтар дазваляе сабе дадаваць толькі асобныя дэталі да гістарычнай канвы («Стану песняй» Л. Арабей, «Крыж на зямлі і поўня ў небе» В. Карамазава і інш.).

Атрыбутыўнымі рысамі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі выступаюць канцэптуальнасць у адборы і трактоўцы гістарычных фактаў, аргументацыя пісьменніцкай пазіцыі праз абмалёўку атмасферы пэўнага часу, выбар канфлікта і персанажаў, характэрных для канкрэтнага храналагічнага перыяду. Мастацкая інтэрпрэтацыя мінулага дазваляе пісьменніку адначасова даследаваць канкрэтна-гістарычныя, экзістэнцыйныя і анталагічныя праблемы. Пісьменнік можа надзяляць рысамі сваіх сучаснікаў гістарычных персанажаў і выдуманых асоб, калі ўзнаўленне мінулага падначалена вырашэнню праблем аўтарскай рэчаіснасці. Выяўленне вечнага ў плыні часу, як правіла, патрабуе ад пісьменніка шырокага ахопу мінулага, выкарыстання магчымасцей жанру аповесці або рамана. Для ўвасаблення гісторыі аўтары нярэдка звяртаюцца да легендаў, паданняў, летапісаў, дакументаў, мемуараў, дзённікаў, эпісталярнай спадчыны рэальных гістарычных асоб. Важным сэнсаўтваральным і стылеўтваральным сродкам у творах пра мінулае выступае спалучанасць часоў. На вобразным узроўні яе звычайна выяўляюць галоўныя героі як носьбіты пэўнага тыпу свядомасці. У творах пра мінулае мастацкі час падпарадкоўваецца эстэтычным установкам пісьменніка, які задае канцэптуальныя каардынаты ў творы і ў залежнасці ад ідэйна-мастацкай задачы акцэнтуе такія ўласцівасці часу, як спыненасць, зваротнасць, шматмернасць, рознаскіраванасць. Мастацкі час разгортваецца ў пададзеных аўтарам падзеях, што маюць суаднесенасць і працягласць; у сюжэце як фоне для спецыфічнага часу персанажаў. Персанажы могуць выступаць і носьбітамі некалькіх часавых вымярэнняў у творы –

скразнымі вобразамі. Індывідуальна-аўтарская тэмпаральная схема дапамагае пісьменніку перадаць дамінантныя рысы канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасці, паказаць падзеі і характары ў іх прычынна-выніковай сувязі.

Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі на ўзроўні структуры твора нараджае пэўную суб'ектную арганізацыю аповеду: ад імя трэцяй ці першай асобы, ад імя ўдзельніка ці сведкі падзей, ад імя аднаго ці некалькіх апавядальнікаў. Для ўзнаўлення гісторыі пісьменнікі нярэдка ўжываюць форму дзённікаў, пісем, мемуараў, сапраўдныя і выдуманыя дакументы, звяртаюцца да такіх прыёмаў, як мантаж, змяшчэнне часавых пластоў, плынь свядомасці, унутраныя маналогі, стылізацыя пад маўленне эпохі, якая эстэтычна рэканструюецца.

Другі раздзел **«Пачатак мастацкага спасціжэння гісторыі беларускімі празаікамі»** складаецца з трох падраздзелаў. У падраздзеле 2.1 **«Гістарычныя рэаліі ў творах даўняй і новай беларускай літаратуры»** заўважаецца, што вытокі мастацкай інтэрпрэтацыі беларускай гісторыі – у «Слове пра паход Ігаравы», беларуска-літоўскіх летапісах, паэмах Я. Вісліцкага і М. Гусоўскага, дзе прасочвалася сувязь даўняга мінулага з падзеямі аўтарскай сучаснасці, а гістарычныя факты дапаўняліся вымыслам. Пісьменнікі XIX стагоддзя акцэнтавалі ўласнае бачанне часава блізкіх ім перыядаў – найперш XVIII стагоддзя, а таксама асобных падзей сярэднявечнай гісторыі, асабліва змаганне з крыжаносцамі. Беларуска-польскія майстры слова абапіраліся на фальклорныя і гістарычныя крыніцы. А. Міцкевіч у паэмах «Гражына» (1823) і «Конрад Валенрод» (1828) праз паказ барацьбы нашых продкаў з крыжаносцамі апеў подзвіг чалавека ў імя радзімы. Творы пра беларускае мінулае Г. Жавускага, Ю. Крашэўскага, І. Ходзькі, Я. Баршчэўскага, В. Савіча-Заблоцкага характарызуюцца павышанай увагай пісьменнікаў да маральна-этычнай праблематыкі, пастаноўкай выдуманых асоб у цэнтр мастацкага дзеяння, шырокім выкарыстаннем этнаграфічна-бытавога матэрыялу. Разам з традыцыйнай апавядальнай формай ад трэцяй асобы ўжываліся прыёмы імітацыі дзённікавых запісаў, прыватных успамінаў: «Успаміны Сапліцы» (1841) Г. Жавускага, «Запіскі квестара» (1844) І. Ходзькі, «Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта (Жаніцьба Ягамосьці пана Шатана Старшага)» (1886) В. Савіча-Заблоцкага. Такія прыёмы эстэтычна апраўдвалі адыход аўтара ад гістарычнай фактаграфіі. Адмысловае мастацкае асэнсаванне гісторыя беларускай зямлі знайшла ў кнізе Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (1844–1846). Гістарычна-легендарнае мінулае згадвалася ў лірычных адступленнях, а ў навелах апавядальнік у рэчышчы хрысціянскага лінеарнага і незваротнага разумення часу падкрэсліваў сувязь і пераемнасць эпох, каштоўнасць для нашчадкаў гістарычнага вопыту продкаў. Гісторыя ў творчасці беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя (Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Савіча-

Заблоцкага) раскрывалася праз асэнсаванне маральна-этычнай праблематыкі, галоўнымі героямі выступалі патрыятычна настроеныя выдуманыя асобы, акцэнтавалася адрознасць этычнага кодэкса продкаў і нашчадкаў, мінулае прадставала маральнай антытэзай недасканалай сучаснасці.

У падраздзеле 2.2 **«Станаўленне мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў беларускай прозе пачатку ХХ стагоддзя»** адзначаецца, што мастацкае ўвасабленне гісторыі істотна дэтэрмінавалася адраджэнскім рухам, які абумовіў тэндэнцыю да гістарыязацыі фальклорнага матэрыялу, адвольную аўтарскую трактоўку перыядаў язычніцтва, Полацкага княства і Вялікага княства Літоўскага. Асноўнымі напрамкамі інтэрпрэтацыі мінулага сталі рамантычна-дыдактычны (К. Каганец), рамантычна-псіхалагічны (М. Гарэцкі), рамантычна-асветніцкі з элементамі аналітызму (В. Ластоўскі). К. Каганец захапляўся старажытнасцю, апрацоўваў народныя легенды і паданні («Засульскія турэ», 1902; «Вітаўка», 1902; «Машэка», 1918; і інш.), тым самым абуджаў у сваіх суайчыннікаў цікавасць да мінулага Радзімы. В. Ластоўскі падкрэсліваў, што гісторыя – фундамент, на якім будуецца жыццё народа, і акцэнтаваў багацце айчыннага мінулага. У цэнтры яго публіцыстыкі знаходзіліся такія з’явы беларускай гісторыі, як судовае права XV–XVI стагоддзяў («Земскія суды» і «Копныя суды», 1912), «земская служба» і «служба баярская» («Станы ў старой Беларусі», 1912), адносіны паміж праваслаўем, каталіцызмам, кальвінізмам і лютэранствам («Раздзелы і сваркі», 1912). В. Ластоўскі актыўна запазычваў сюжэты з легендаў і паданняў. Цэнтральнымі ў яго прозе сталі праблемы паходжання беларусаў, шляхі развіцця беларускай гісторыі і культуры. Дамінантным у мастацкім увасабленні мінулага быў прынцып гістарычнай інверсіі, згодна з якім мінулае – узор для сучаснасці і будучыні. У аповесці «Лабірынты» (1923) пісьменнік сфармуляваў канцэпцыю гістарычнага развіцця беларусаў: яно пачыналася з так званага «залатога веку», пасля наступіў перыяд заняпаду, але адраджэнне «залатога веку» магчыма пры ўмове абуджэння гістарычнай памяці грамадства. Шляхі асэнсавання пісьменнікам айчыннага мінулага былі дынамічнымі: В. Ластоўскі пачаў з апрацоўкі народных паданняў («Сож і Няпро», 1911; «Беларускі радавод», 1913; «Разбойнік», 1913; «Векавечная мяжа», 1917), паспрабаваў сінтэзаваць элементы нарыса, эсэ і апавядання (нізка «З нашай мінуўшчыны», 1916), а пасля імкнуўся спасцігнуць псіхалогію чалавека іншай эпохі («Часы былі трывожныя», 1924). М. Гарэцкі падкрэсліваў важнасць мастацкага спасціжэння мінулага дзеля пашырэння ідэй беларускага нацыянальнага адраджэння (артыкулы «Развагі і думкі», «Наш тэатр»). Рамантычным пафасам узвелічэння высокай місіі творцы ў захаванні памяці пра мінулае было напоўнена апавяданне «Лірныя спевы» (1914). Літаратурная спадчына М. Гарэцкага пераканаўча даказвае, што інтэрпрэтацыя гісторыі скіроўвалася на сцвярджэнне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.

Ідэя вялікага выхаваўчага значэння мінуўшчыны, усведамленне гісторыі як трывалага падмурку будучыні народа і асобнага чалавека – атрыбутыўныя рысы эстэтычнай інтэрпрэтацыі мінулага ў прозе пачатку XX стагоддзя.

У падраздзеле 2.3 **«Мастацкае ўвасабленне гісторыі ў творчасці пісьменнікаў 1920–1950-х гадоў»** падкрэсліваецца, што празаікі па-новаму расстаўлялі акцэнты ў трактоўцы суадносін мінулага, сучаснасці і будучыні. Важнымі прызнаваліся сучаснасць і будучыня, мінулае выступала фонам для ўзвышэння сучаснасці. Пісьменнікі 1920-х гадоў адлюстраванне сучаснасці суправаджалі экскурсамі ў адносна недалёкае мінулае, каб акцэнтаваць яго сацыяльную недасканаласць (апавяданні са зборніка «Досвіткі», 1926, М. Гарэцкага, «Дванаццацігоднікі», 1921, З. Бядулі, «Рамеа і Джульета на Беларусі», 1923, Я. Нёманскага). Празаікі вымушаны былі браць на сябе ролю гісторыкаў (апавяданні М. Гарэцкага «Бітва на Уле», «Уцёкі Сярэбранага» 1921 года, дзе ішла размова пра Лівонскую вайну; аповесць «Францішак Скарына» 1926 года С. Хурсіка). Створаны ў часы беларусізацыі вобраз Ф. Скарыны сцвярджаў вызначальную ролю асветы ва ўдасканаленні грамадства. Скарына паказваўся мысляром, заклапочаным лёсам простых людзей і будучыняй беларускага краю. Пісьменнікам 1930-х гадоў гісторыя бачылася ў выглядзе руху да лепшага жыцця. Кантрасты мінулага і сучаснасці – рыса сацыяльна-бытавых раманаў, дзе адсутнічалі гістарычныя асобы, але згадваліся падзеі пачатку XX стагоддзя: першая руская рэвалюцыя, сталыпінская рэформа, Першая сусветная вайна, падзеі 1917 года і грамадзянскай вайны («Бацькаўшчына», 1931, К. Чорнага, «Праз гады», 1934, П. Галавача). Сацыяльныя канфлікты як асноўная лінія характарыстыкі мінулага – вызначальная асаблівасць аповесці «Арцыбіскуп і смерд» (1931) Ю. Віцьбіча пра супрацьстаянне прыхільнікаў і праціўнікаў Брэсцкай царкоўнай уніі.

Маральным імператывам слоўнага мастацтва перыяду Вялікай Айчыннай вайны стала артыкуляцыя гераічнага пачатку ў народным характары. Над аповесцю пра супраціў мангола-татарскаму нашэсцю «У імя дзяцей (Настася Мякота)» працаваў Я. Дыла. Падзеі 1812 года і Вялікай Айчыннай вайны асацыятыўна супастаўляліся ў аповесці «Адвечнае» Б. Мікуліча. У колькасна нешматлікіх творах пра мінулае першага пасляваеннага дзесяцігоддзя значнае месца адводзілася ўзнаўленню шляху выдатных дзеячаў культуры (аповесць «Развітанне», 1947, Б. Мікуліча пра Максіма Багдановіча, рускамоўны раман «Георгій Скарына», 1951, М. Садковіча і Я. Львова, аповесць «Ой, рана на Івана», 1956, З. Бандарынай пра Янку Купалу). Скарына ў рамане Садковіча і Львова – чалавек, апантаны прагай набыцця ведаў і служэння грамадству. Купала і Багдановіч прадставалі сацыяльна актыўнымі людзьмі, упэўненымі ў лепшай будучыні свайго народа. Назіраліся сацыялагічная рэдукцыя і асучасніванне гістарычных персанажаў. Інтэрпрэтацыя нацыянальна-

вызваленчай барацьбы XVII стагоддзя ў «Аповесці пра яснага Стахора» (1956) М. Садковіча падпарадкоўвалася ідэі пра пераемнасць у змаганні людзей за сацыяльную справядлівасць, узвышэння простага чалавека. Ва ўзнаўленні мінулага дамінаваў сацыяльны план, маральная характарыстыка асобы суадносілася з сацыяльнай прыналежнасцю. Толькі ў рамане «Георгій Скарына» без тэндэнцыйнага завастрэння сацыяльных момантаў паказана сувязь дзейнасці Скарыны з ідэямі еўрапейскіх гуманістаў.

Раздзел 3 **«Развіццё мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі празаікамі 1960-х – сярэдзіны 1980-х гадоў»** складаецца з трох падраздзелаў. У падраздзеле 3.1 **«Уладзімір Караткевіч і героіка-рамантычная інтэрпрэтацыя гісторыі ў беларускай прозе»** гаворыцца, што адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі мінулага заключалася ў звароце да пераломных перыядаў айчыннай гісторыі, ва ўслаўленні самаахвярнага чалавека-патрыёта. Галоўнымі героямі ў творах Караткевіча выступалі пераважна малавядомыя гістарычныя ці выдуманыя асобы (аповесці «Цыганскі кароль», 1958; «Сівая легенда», 1960; «Дзікае паляванне караля Стаха», 1964; раманы «Каласы пад сярпом тваім», 1965; «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»,1966; апавяданні «Паляшук», 1954; «Кніганошы», 1962; «Сіняя-сіняя…», 1964, і інш.). Эстэтычны ідэал пісьменніка – народны заступнік, высокамаральны чалавек (Раман Ракутовіч, Алесь Загорскі, Грыміслаў Валюжыніч, Юрась Братчык). У. Караткевіч хоць і прытрымліваўся прынцыпу канкрэтна-гістарычнага апісання падзей, што адпавядае рэалістычнаму бачанню мінулага, аднак актыўна выкарыстоўваў сродкі сімвалічна-іншасказальнай вобразнасці, уласцівыя рамантычнаму пісьму. Першым у айчыннай прозе ён здолеў гарманічна спалучыць гістарычны, нацыянальны і сацыяльны ракурсы пры ўвасабленні мінулага, заклаў ідэйна-эстэтычныя асновы развіцця героіка-рамантычнага напрамку з дамінаваннем патрыятычнага пафасу ў інтэрпрэтацыі мінулага, даказаў прадуктыўнасць ускладнення структуры мастацкага часу праз сумяшчэнне розных храналагічных пластоў («Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі»). Прадстаўнікі гэтага напрамку (А. Якімовіч, І. Клаз, Э. Ялугін) асэнсоўвалі найперш працэсы выспявання сацыяльнай свядомасці беларусаў, сцвярджалі гераічны складнік у іх нацыянальным характары праз адлюстраванне народных паўстанняў (А. Якімовіч, І. Клаз), услаўленне памкненняў чалавека-асветніка (Э. Ялугін). Героіка-рамантычная інтэрпрэтацыя мінулага спалучалася з шырокім выкарыстаннем этнаграфічна-бытавога матэрыялу для ўзнаўлення гістарычных рэалій і з паэтызацыяй асобы, што самасцвярджаецца праз пераадоленне неспрыяльных абставін. У творах рускамоўных пісьменнікаў (І. Клаза, Э. Ялугіна) значна радзей сустракаліся фальклорныя элементы, чым у беларускамоўных, а айчынная гісторыя найперш падавалася на фоне гісторыі суседніх народаў.

У падраздзеле 3.2 **«Сацыяльна-псіхалагічная інтэрпрэтацыя гісторыі»** адзначаецца, што аўтары сацыяльна-псіхалагічнага напрамку (А. Чарнышэвіч, М. Лобан, Л. Дайнека, Э. Скобелеў, К. Тарасаў) імкнуліся выявіць заканамернае ў гістарычнай канкрэтыцы, панарамна паказаць грамадска-палітычныя, сацыяльныя асаблівасці эпохі, даследаваць суадносіны асобы і часу і пры гэтым спалучалі элементы сацыяльна-бытавой і гістарычнай прозы. У раманах-хроніках «Засценак Малінаўка» (1965) А. Чарнышэвіча, «На парозе будучыні» (1963) М. Лобана, дылогіі «Людзі і маланкі» (1978) і «Запомнім сябе маладымі» (1981) Л. Дайнекі галоўныя героі – грамадска актыўныя людзі з сацыяльных нізоў. Народ рэпрэзентаваўся вырашальнай сілай гістарычнага працэсу, прыватны чалавечы лёс ілюстраваў гісторыю краю.

Празаікі 1970-х – першай паловы 1980-х гадоў спрабавалі даць новую трактоўку многім вядомым падзеям мінулага, удасканальвалі формы аповеду. Паказальная ў гэтых адносінах стылізаваная пад дзённік аповесць Б. Сачанкі «Дыярыуш Мацея Белановіча» (1973) пра драматычнае для беларусаў супрацьстаянне ў XVII стагоддзі паўстанцаў-казакаў уладам Рэчы Паспалітай. Упершыню ў айчыннай прозе Б. Сачанка з гуманістычных пазіцый асудзіў жорсткасць абодвух бакоў у казацка-шляхецкіх войнах. Новай была і інтэрпрэтацыя пісьменнікамі асобы выдатнага дзеяча культуры (аповесці «Пры апазнанні – затрымаць», 1983, В. Хомчанкі пра Ф. Багушэвіча; «Восень пасярод вясны», 1984, А. Мальдзіса пра У. Сыракомлю, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага), што заключалася ў выяўленні асобасных якасцей выдатных людзей, у рэпрэзентацыі прыватнага, а не грамадскага боку іх жыцця. К. Тарасаў і Э. Скобелеў у рускамоўных творах на матэрыяле айчыннага мінулага галоўным чынам асэнсоўвалі «вечныя» праблемы. Аповесці К. Тарасава «Адстаўка штабс-капітана, ці ў час Стральца» (1977), «Пагоня на Грунвальд» (1980), «Выпіць кубак» (1984) спалучалі адзнакі гісторыка-дэтэктыўнай і псіхалагічнай прозы. Праз гістарычныя канфлікты там раскрываліся пазачасавыя: прычыны раз’яднанасці паміж людзьмі, суадносіны грамадскага і асабістага ў маральным выбары чалавека. Для псіхалагічнай пераканаўчасці і ўзнаўлення спецыфічнага гістарычнага каларыту (падзей 1864 года, пачатку XV і сярэдзіны XVII стагоддзя) ужывалася форма аповеду ад імені іх непасрэднага ўдзельніка. Арыгінальнае прачытанне гісторыі славян адбілася ў стылізаваным пад старажытнарускі летапіс рускамоўным рамане «Мірослаў, князь дрыгавіцкі: (дума пра мінулае)» (1979) Э. Скобелева. Амаль тысячагадовая гісторыя славянства, у трактоўцы безыменнага летапісца, – няспынная барацьба за захаванне самабытнасці. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі славян, лёсу дрыгавіцкага князя Міраслава падначальваліся ідэі ўзвышэння духоўнай нязломнасці чалавека.

У падраздзеле 3.3 **«Дакументальна-мастацкая проза»** даказваецца, што дакументалізм як прамое ўключэнне дакумента ў тэкст або стварэнне на аснове дакумента аўтарскай версіі падзей, максімальна набліжаных да дакумента, – адна з жанраўтваральных і структурна-тыпалагічных прыкмет твораў на гістарычную тэму. Дакументальна-мастацкая лінія ў прозе пра мінулае была прадстаўлена галоўным чынам гісторыка-біяграфічнымі творамі. Іх аўтары абапіраліся на факты з жыцця вядомага чалавека, засяроджваліся на ўзаемаадносінах асобы і эпохі, на выяўленні грамадзянскай пазіцыі гістарычнай асобы: «Ад роднае зямлі…» (1962), «На шырокі прастор» (1972), «Крыжавыя дарогі», «Сейбіт песні» С. Александровіча пра Якуба Коласа, «На струнах буры» (1967), «Стану песняй» (1977) Л. Арабей пра Цётку, «Пасля нябыту» (1983) Э. Ялугіна пра Цішку Гартнага. Адчувальнай прысутнасцю ў суб'ектнай структуры аўтара з яго індывідуальным бачаннем выдатных асоб вызначаліся творы «Загадка Багдановіча» (1968) М. Стральцова пра Максіма Багдановіча, «Як агонь, як вада» (1984) А. Лойкі пра Янку Купалу, дзе ўдала спалучаліся дакумент, эсэ, элементы біяграфічнага і сацыяльна-бытавога раманаў.

Перспектыўнасць аб'яднання дакументальнага і мастацкага планаў прадэманстраваў І. Шамякін у панарамным рамане «Петраград-Брэст» (1981). Там раскрывалася хроніка падпісання Брэсцкага мірнага пагаднення паміж савецкай Расіяй і кайзераўскай Германіяй. Героі твора – дзеячы бальшавіцкай партыі (Ленін, Крупская, Сталін, Троцкі, Бухарын, Зіноўеў, Каменеў, Бонч-Бруевіч і інш.), а таксама выдуманыя асобы (Міра, Сяргей Багуновіч, Баляслаў Кручэўскі і інш.). Раман «Петраград-Брэст» – спроба перадаць складаную палітру гістарычнай рэчаіснасці, аднак сацыякультурная атмасфера часу не дазволіла пісьменніку ўзнавіць падзеі ў поўным аб'ёме, пераадолець «інерцыю жанравай формы» (тэрмін Н.Л. Лейдэрмана).

У раздзеле 4 **«Дыяпазон мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творах канца ХХ стагоддзя»** сцвярджаецца, што гэты перыяд характарызуецца змяшчэннем пісьменніцкіх акцэнтаў са сферы сацыяльных праблем у маральна-этычную і філасофскую, узмацненнем гуманістычнага пафасу твораў, паглыбленнем цікавасці да прыватнага жыцця, да псіхалогіі гістарычных асоб. Прадметам мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі часта станавіліся малавядомыя, неадназначныя, з пункту гледжання грамадскай думкі ранейшага часу, падзеі і асобы (князі-заснавальнікі беларуска-літоўскай дзяржавы, нацыянальна-вызваленчы рух пачатку ХХ стагоддзя і яго прадстаўнікі і інш.).

У падраздзеле 4.1 **«Падзейны напрамак у мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі»** заўважаецца, што для прыхільнікаў падзейнага напрамку актуальнай заставалася караткевічаўская традыцыя рамантызацыі і паэтызацыі моцных духам герояў, падкрэслена творчая апрацоўка фактычнага матэрыялу, дынамічныя сюжэтныя лініі, шырокае выкарыстанне элементаў знешняй

займальнасці (меладраматычных сюжэтаў, дэтэктыўных элементаў), фальклорна-міфалагічнай спадчыны. Падзейны напрамак у інтэрпрэтацыі гісторыі ярка прадстаўлены раманамі «Меч князя Вячкі», 1987, «След ваўкалака», 1988, «Жалезныя жалуды», 1993, Л. Дайнекі, «Залатая жрыца Ашвінаў», 1997–1999, «Альгердава дзіда», 2001, В. Іпатавай, «Пабуджаныя», 1988, «Свой дом», 1989, «Кліч роднага звона», 1997, Г. Далідовіча і іншых аўтараў, што ўзнаўлялі этапы станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Беларускамоўнымі і рускамоўнымі (М. Галдзянковым, С. Зайцавым, Я. Коневым, Ю. Татарынавым і інш.) аўтарамі інтэрпрэтаваліся практычна ўсе перыяды айчыннай і часткова сусветнай гісторыі ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя. Падзейны напрамак у мастацкай трактоўцы гісторыі беларускімі празаікамі канца XX стагоддзя адметны тым, што прыгодніцкая лінія ўжывалася пісьменнікамі не толькі, каб забаўляць чытача, дынамізаваць аповед, а каб актывізаваць цікавасць да гісторыі роднай зямлі, выхоўваць высокія маральныя якасці суграмадзян. У прозе пачатку XXI стагоддзя заўважаецца тэндэнцыя да росту адвольнага мастацкага мадэлявання аўтарамі гістарычных падзей і асоб (Глеб Менскі, Барбара Радзівіл, Тадэвуш Касцюшка), што зніжае пазнавальны патэнцыял твораў і не заўсёды падвышае іх эстэтычны ўзровень.

У падраздзеле 4.2 **«Аналітычны напрамак у мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі»** адзначаецца, што аналітычны напрамак у айчыннай прозе рэпрэзентуюць творы К. Тарасава, У. Арлова, В. Коўтун, Э. Скобелева, А. Наварыча, А. Федарэнкі. Яму ўласціва дамінаванне маральна-этычнай і філасофскай праблематыкі, псіхалагізм, падтэкставасць, асацыятыўнае супастаўленне розных храналагічных эпох, выяўленне анталагічнага пачатку ў канкрэтнай гістарычнай з’яве. Мінулае, яго падзеі і асобы для прадстаўнікоў аналітычнага напрамку – гэта не толькі аб’ект адлюстравання, але прадмет і сродак даследавання так званых вечных праблем. Так, у раманах «Крыж міласэрнасці» (1988), «Пакліканыя» (1998–2007) В. Коўтун мастацкая інтэрпрэтацыя жыцця і дзейнасці Цёткі і Ефрасінні Полацкай падначалена асэнсаванню праблемы духоўнага подзвігу асобы ў імя Радзімы і народа, артыкуляцыі сакральнасці паняццяў «дабро» і «любоў». У аповесці «Нічые» (1998–2000) А. Федарэнкі відавочны сэнсава-асацыятыўныя паралелі паміж настроямі ў беларускім грамадстве пачатку 1920-х і пачатку 1990-х гадоў. Нярэдка прадстаўнікі аналітычнага напрамку інтэрпрэтацыйны характар аповеду падкрэслівалі суб’ектнай арганізацыяй твораў: звярталіся да імітацыі формы ліста, дзённіка, мемуараў, граматы з магістрацкага архіва, маналога, плыні свядомасці персанажа (У. Арлоў, К. Тарасаў, Э. Скобелеў), да гульнёвага пачатку, інтэртэкстуальнасці (А. Наварыч, Л. Рублеўская).

У падраздзеле 4.3 **«Эсэістычны напрамак у мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі»** нагадваецца, што эсэ – жанр, у якім пісьменнік разважае над пэўнымі

праблемамі, дзе выказванні маюць падкрэслена суб'ектыўны характар, а кампазіцыя цалкам свабодная ад жанравых канонаў. Канец XX стагоддзя – спрыяльны час для развіцця эсэістычнага напрамку ў мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі. Адчувальны імпульс яго інтэнсіўнаму эстэтычнаму сцвярджэнню даў выхад у свет рамана-эсэ А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» (1990), дзе біяграфія беларускага першадрукара стала канвой для асэнсавання пытанняў пра месца асобы ў вялікім гістарычным часе, пра імгненнае і вечнае. Выяўленне сувязі паміж рознымі эпохамі, асобай і творчасцю ўласціва эсэ «Крыж на зямлі і поўня ў небе» (1991) В. Карамазава пра В. Бялыніцкага-Бірулю. Эсэістычны напрамак быў колькасна меншым за падзейны і аналітычны, аднак сутнасна важны для развіцця айчыннай прозы. У. Арлоў («Таямніцы Полацкай гісторыі», 1994), В. Чаропка («Імя ў летапісе», 1994; «Уладары Вялікага княства», 1996), І. Масляніцына і М. Багадзяж («Слава і няслаўе», 1995), А. Марціновіч («Зерне да зерня», 1996; «Залатавуст з Турава, альбо Якая яна, старажытная Тураўшчына?», 2000; «Сімяон, сын Полацка», 2001) даследавалі сувязь паміж асобай і часам, акцэнтавалі значнасць інтэрпрэтацыі гісторыі з пазіцый новых сацыяльных рэалій.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі – канцэптуальнае, ініцыятыўна-творчае спасціжэнне пісьменнікам сэнсу гістарычных з'яў, прадстаўленае ў вобразнай форме, а таму полісемантычнае па сваёй сутнасці. На падставе суадносін дакументальнага матэрыялу і мастацкага вымыслу, а таксама функцыі гістарычнай асобы ў сюжэце твора вылучаюцца тры асноўныя падыходы да ўзнаўлення пісьменнікамі гістарычных рэалій: суб'ектыўна-творчы, аб'ектыўна-творчы, дакументальна-творчы.

Суб'ектыўна-творчаму падыходу ўласцівы рэпрэзентацыя гістарычнага часу праз лёс выдуманай асобы, стварэнне верагоднасных варыянтаў мінулага на аснове рэальных фактаў. Аб'ектыўна-творчы падыход патрабуе выбару рэальнай гістарычнай асобы ў якасці галоўнага героя твора, мастацкага абагульнення гістарычнага матэрыялу, ураўнаважанага выкарыстання вымыслу і фактаў. Жанраўтваральнай і тыпалагічнай прыкметамі дакументальна-творчага падыходу да ўзнаўлення гісторыі выступае адлюстраванне мінулага на строга дакументальнай аснове з параўнальна невысокай ступенню вымыслу, дадумвання сапраўдных гістарычных фактаў [1, 2, 3, 4, 5, 6, 8, 10, 11].

2. Мастацкая інтэрпрэтацыя мінулага ў беларускай прозе XX стагоддзя дэтэрмінавалася ўніверсальнымі заканамернасцямі пазнання; сацыяльна-

гістарычнымі і культурнымі працэсамі. Адраджэнскі рух у першай трэці XX стагоддзя абумовіў цікавасць пісьменнікаў да старажытнасці як важнага этапу стаўлення беларускага этнасу. Спецыфіка ўвасаблення гісторыі ў 1920–1950-х гадах прадвызначалася наступствамі рэвалюцый 1917 года і грамадзянскай вайны, распаўсюджаным у грамадстве меркаваннем, што мінулае ў аксіялагічным плане для грамадства менш значнае за сучаснасць і будучыню. Гэта скіравала ўвагу празаікаў найперш на адлюстраванне сацыяльных канфліктаў. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны прадвызначылі зварот празаікаў 1960-х – сярэдзіны 1980-х гадоў да гераізацыі мінулага, да асэнсавання значнасці сацыяльна-грамадскага і культурнага вопыту ранейшых гістарычных эпох для пісьменніцкай сучаснасці. Далейшае развіццё беларускай дзяржаўнасці ў канцы XX абумовіла неабходнасць шматграннага храналагічнага і эстэтычнага ўзнаўлення мінулага. Пераканаўчым сведчаннем залежнасці мастацкай інтэрпрэтацыі падзей (станаўлення дзяржаўнасці ў перыяд Сярэднявечча, Лівонскай, казацка-шляхецкіх, грамадзянскай вайнаў, паўстанняў 1830 і 1863 гадоў і г.д.) і асоб (Рагнеды, Е. Полацкай, У. Полацкага, Ф. Скарыны, М. Глінскага, Я. і Б. Радзівілаў, К. Каліноўскага, Цёткі, Я. Купалы і інш.) ад сацыяльна-гістарычных абставін выступае іх розная трактоўка ў розныя храналагічныя перыяды. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі залежала ад узроўню эстэтычнага развіцця літаратуры, ад засваення пісьменнікамі прынцыпаў рамантычнай і рэалістычнай паэтыкі, ад асабістай зацікаўленасці празаікаў мінулым [1, 2, 3, 7, 8, 12, 18, 19, 20, 24].

3. Пачатак мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі быў пакладзены ў творах даўняй беларускай літаратуры і XIX стагоддзя. Ён характарызуецца пераважнай ўвагай да блізкіх пісьменніцкай сучаснасці эпох, да мінулага паасобных мясцін Беларусі, акцэнтаваннем этычнай дасканаласці мінулага ў параўнанні з аўтарскай сучаснасцю («Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» Я. Чачота, «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага, «Люцынка, альбо Шведы на Літве» В. Дуніна-Марцінкевіча).

Інтэнсіўнае станаўленне мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі адбывалася ў першай палове XX стагоддзя. Пісьменнікі гістарызавалі мінулае, занатаванае ў фальклорных творах («Вітаўка», «Засульскія турэ», «Машэка» К. Каганца, «Сож і Няпро», «Разбойнік», «Векавечная мяжа», «Сцяпан і Вялляна», «Каменная труна» В. Ластоўскага), прапаноўвалі свае гіпотэзы паходжання і развіцця беларусаў («Прывід», «Беларускі радавод», «Лабірынты» В. Ластоўскага). Гістарычны працэс асэнсоўваўся як паслядоўная пераемнасць храналагічных эпох. К. Каганец, В. Ластоўскі, М. Гарэцкі бачылі сваю задачу ў фарміраванні грамадска-патрыятычных каштоўнасцей суайчыннікаў, Я. Дыла, Б. Мікуліч, М. Садковіч – у сцвярджэнні гераічнага мінулага, якое стала запарукай перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Паўнавартаснае развіццё мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі пачалося з другой паловы XX стагоддзя. Яно вызначалася ўвагай празаікаў да пераломных этапаў айчыннага мінулага, актыўнай распрацоўкай індывідуальна-аўтарскіх канцэпцый гістарычных падзей («Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча, «Міраслаў, князь Дрыгавіцкі» Э. Скобелева, «Залатая жрыца Ашвінаў» і «Вяшчун Гедзіміна» В. Іпатавай, «Дзень, калі ўпала страла» У. Арлова і інш.), шматбаковай эстэтычнай рэпрэзентацыяй культурна-грамадскіх дзеячаў («Як агонь, як вада», «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае» А. Лойкі, «Час чумы» У. Арлова, «Крыж міласэрнасці» і «Пакліканыя» В. Коўтун і інш.). Празаікамі першай паловы і сярэдзіны XX стагоддзя гісторыя трактавалася як крыніца звестак пра мінулае, як своеасаблівая энцыклапедыя, аўтары другой паловы XX стагоддзя сцвярджалі погляд на гісторыю адначасова і як на энцыклапедыю і як на таямніцу, што патрабуе разгадкі (творы У. Караткевіча, Э. Скобелева, У. Арлова, А. Наварыча, Л. Рублеўскай) [4, 5, 6, 9, 10, 12, 21, 24].

4. Дынаміка мастацкага асэнсавання гісторыі на праблемна-тэматычным і жанрава-стылёвым узроўнях – сведчанне пастаяннага творчага пошуку пісьменнікаў у сферы эстэтычнага ўвасаблення мінулага.

Айчынныя пісьменнікі пачатку XX стагоддзя адлюстроўвалі галоўным чынам падзеі Сярэднявечча, закраналі пытанні паходжання беларусаў, іх гістарычнага лёсу, развіцця культуры, імкнуліся вызначыць месца беларусаў у славянскім свеце. Празаікі выкарыстоўвалі жанр апавядання, шырока ўжывалі міфа-паэтычную вобразнасць, матывы і сюжэты з легендаў і паданняў (К. Каганец, В. Ластоўскі, М. Гарэцкі), летапісаў (В. Ластоўскі, М. Гарэцкі). У 1920–1950-х гадах пісьменнікі звярталіся да інтэрпрэтацыі жыцця і дзейнасці асоб, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё культуры Беларусі («Францішак Скарына» С. Хурсіка, «Развітанне» Б. Мікуліча, «Георгій Скарына» М. Садковіча і Я. Львова, «Ой, рана на Івана» З. Бандарынай), народных паўстанняў супраць сацыяльнага прыгнёту («Аповесць пра яснага Стахора» М. Садковіча) і чужаземных захопнікаў («Адвечнае» Б. Мікуліча, «У імя дзяцей (Настася Мякота)» Я. Дылы). Асноўнае месца адводзілася асэнсаванню ўзаемаадносін выдатнай асобы і народа. Мінулае найперш увасаблялася ў жанры аповесці, у якім пад уплывам дамінавання ўяўленняў пра выхаваўчую функцыю літаратуры гістарычныя персанажы асучасніваліся.

Проза 1960-х – сярэдзіны 1980-х гадоў, дзе выразна вылучаліся героіка-рамантычны (У. Караткевіч, А. Якімовіч, І. Клаз, Э. Ялугін), сацыяльна-псіхалагічны (А. Чарнышэвіч, М. Лобан, Э. Скобелеў, К. Тарасаў, І. Шамякін, А. Мальдзіс, В. Хомчанка), дакументальна-мастацкі (С. Александровіч, А. Лойка, Л. Арабей, М. Стральцоў) напрамкі ў інтэрпрэтацыі гісторыі, засяроджвалася на асэнсаванні ўзаемаадносін асобы і эпохі, суадносін нацыянальнага і агульначалавечага, на распрацоўцы маральна-этычнай

праблематыкі. Дамінантнымі жанрамі рэпрэзентацыі гісторыі выступалі аповесць і раман. Вялікую ўвагу празаікі канца XX стагоддзя надавалі ўвасабленню этапаў беларускай дзяржаўнасці («Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды» Л. Дайнекі, «Залатая жрыца Ашвінаў», «Вяшчун Гедзіміна», «Альгердава дзіда» В. Іпатавай, «Пабуджаныя», «Свой дом», «Кліч роднага звона» Г. Далідовіча), неадназначных у выніковых ацэнках перыядаў мінулага («Сны імператара» У. Арлова, «Храм без Бога» В. Чаропкі, «Літоўскі воўк» А. Наварыча, «Нічые» А. Федарэнкі), асвятленню лёсу дзяржаўных дзеячаў (Усяслаў Чарадзей, Міндоўг, Гедымін, Альгерд, М. Глінскі і інш.), асэнсаванню ў сінхронным і дыяхронным сацыякультурным кантэксце такіх асоб, як Францыск Скарына, Ефрасіння Полацкая, Кастусь Каліноўскі, паказу прыватнага чалавека на шырокім гістарычным фоне. Імкненне аўтараў выйсці за межы канкрэтнага гістарычнага перыяду, адлюстраваць мастацкае дзеянне ў адзінстве мінулага, сучаснасці і будучыні істотна ўзмацняла філасофскі план твораў, надавала аналітычнасць, прадвызначала іх жанрава-стылёвы сінкрэтызм. У мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі беларускімі празаікамі канца XX стагоддзя выразна вылучаліся падзейны (Л. Дайнека, В. Іпатава, Г. Далідовіч і інш.), аналітычны (В. Коўтун, К. Тарасаў, І. Шамякін, Э. Скобелеў і інш.) і эсэістычны (А. Лойка, Я. Міклашэўскі, І. Масляніцына і М. Багадзяж, А. Марціновіч і інш.) напрамкі, дамінавалі жанры рамана, аповесці, эсэ. Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі суправаджалася выпрацоўкай далейшых шляхоў развіцця айчыннай прозы праз арганічнае спалучэнне анталагічнай і канкрэтна-гістарычнай праблематыкі з дамінаваннем анталагічнай (У. Арлоў, К. Тарасаў, В. Коўтун, І. Шамякін); праз жанрава-стылёвыя эксперыменты: сінтэз элементаў розных жанраў у межах аднаго мастацкага цэлага («Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» А. Лойкі, «Крыж на зямлі і поўня ў небе» В. Карамазава, «Золата забытых магіл» Л. Рублеўскай, «Попел і снег» С. Зайцава і інш.), ускладненне суб’ектнай структуры твораў за кошт стылізацыі пад форму дзённіка («Дыярыуш Мацея Белановіча» Б. Сачанкі, «Архангел святой Ганны» В. Чаропкі), навуковага даследавання («Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча» Я. Міклашэўскага), летапісу («Міраслаў, князь дрыгавіцкі: (дума пра мінулае)» Э. Скобелева), нататкаў («Сведка: (запіскі капітана Цімкова)» Э. Скобелева, «Чорная княгіня» В. Іпатавай), прыватнага пісьма («Пішу вам у Масковію...», «Пакуль не згасла свечка» У. Арлова), а таксама інтэртэкстуальнасці, калажнасці («Літоўскі воўк» А. Наварыча, «Карона Вялікага княства» У. Бутрамеева) [1, 2, 3, 8, 9, 10, 11, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 23, 25, 26].

5. Атрыбутыўнымі рысамі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў беларускай прозе XX стагоддзя сталі: паказ айчыннай гісторыі як арганічнай часткі сусветнай; акцэнтаванне героіка-патрыятычнага пафасу; выхаваўча-асветніцкая

скіраванасць твораў, звязаная з усведамленнем пісьменнікамі неабходнасці развіцця ў суайчыннікаў нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнага гонару і годнасці; дамінантная ўвага да лёсу дзеячаў культуры; адлюстраванне мінулага ў кантэксце духоўнай спадчыны беларусаў, у цеснай сувязі з фальклорам, міфалогіяй, народнай філасофіяй, этыкай [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 13].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Атрыманыя высновы з’яўляюцца актуальнымі і значнымі для вывучэння беларускай літаратуры ў шырокім сацыякультурным кантэксце. Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшай тэарэтычнай распрацоўкі пытанняў мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў літаратуры, суадносін прыгожага пісьменства і рэчаіснасці. Дысертацыйная праца ў значнай меры дапаўняе прынятыя раней уяўленні пра развіццё айчыннай літаратуры: разглядаюцца недастаткова даследаваныя творчыя персаналіі (Г. Жавускі, Ю. Крашэўскі, І. Ходзька, В. Савіч-Заблоцкі, С. Хурсік, Я. Дыла, Б. Мікуліч, М. Садковіч, І. Клаз, Э. Ялугін, Э. Скобелеў, С. Александровіч, В. Коўтун, А. Наварыч, А. Федарэнка), творы рускамоўных аўтараў Беларусі («Георгій Скарына», «Аповесць пра яснага Стахора» М. Садковіча, «Белая Русь» І. Клаза, «Мсціслаўцаў посах» Э. Ялугіна, «Мірослаў, князь дрыгавіцкі: (дума пра мінулае)», «Сведка: (запіскі капітана Цімкова)» Э. Скобелева, «Пан Кміціч» М. Галдзянкова, «Перамагаючы – азірніся», «Попел і снег» С. Зайцава, «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі», «Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі» Я. Конева, «Вераадступнік», «Яцвягі» Ю. Татарынава), матэрыялы пра якіх могуць быць запатрабаваныя для комплекснага вывучэння літаратуры Беларусі і выкарыстаныя для распрацоўкі лекцыйных і спецыяльных курсаў па гісторыі беларускай літаратуры, уводзінах у літаратуразнаўства, гісторыі Беларусі, для напісання магістарскіх дысертацый, дыпломных і курсавых прац.

Матэрыялы і вывады дысертацыі таксама прыдатныя да ўжывання ў адукацыйнай сферы пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, у працэсе правядзення выхаваўчай, ідэалагічнай працы, для выдання энцыклапедычных і краязнаўчых даведнікаў, для арганізацыі працы гістарычных, краязнаўчых, літаратурных музеяў, папулярызацыі беларускай літаратуры і культуры ў сродках масавай інфармацыі. Матэрыялы даследавання знайшлі практычнае прымяненне ў спецкурсе «Беларуская літаратура ў славянскім культурным кантэксце», які чытаўся студэнтам спецыяльнасці «Беларуская філалогія»; выкарыстоўваліся выкладчыкамі гістарычнага факультэта УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» ў працэсе выкладання гісторыі Беларусі (акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання прыкладаюцца ў «**Дадатках А, Б, В, Г**»).

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Манаграфія**

1. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў творчасці празаікаў Віцебшчыны : манаграфія / Г.В. Навасельцава. – Віцебск : Віцеб. дзярж. ун-т, 2011. – 104 с.

**Артыкулы ў навуковых часопісах**

2. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў творчасці Вацлава Ластоўскага / Г.В. Навасельцава // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2007. – № 2 (17). – С. 107–110.

3. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў прозе Яна Баршчэўскага / Г.В. Навасельцава // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2008. – № 1 (47). – С. 115–119.

4. Навасельцава, Г.В. Мастацкі гістарызм у прозе Яна Баршчэўскага / Г.В. Навасельцава // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. – 2008. – № 1. – С. 71–78.

5. Навасельцава, Г.В. Мастацкі гістарызм у прозе Вацлава Ластоўскага / Г.В. Навасельцава // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2008. – № 7. – С. 149–153.

6. Навасельцава, Г.В. Мастацкі гістарызм у прозе Уладзіміра Караткевіча / Г.В. Навасельцава // Известия Гомел. гос. ун-та. – 2008. – № 6 (51), ч. 1. – С. 144–150.

7. Навасельцава, Г.В. Увасабленне гістарычнага мінулага ў беларускай і чэшскай літаратурах XIX стагоддзя / Г.В. Навасельцава // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. Сер. філал. навук. – 2008. – № 2 (10). – С. 50–57.

8. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў прозе Уладзіміра Караткевіча і Уладзіслава Ванчуры / Г.В. Навасельцава // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та. – 2009. – № 2/3 (33). – С. 131–137.

9. Навасельцава, Г.В. Мастацкае ўвасабленне мінулага ў творчасці рускамоўных пісьменнікаў Беларусі апошняй трэці XX стагоддзя / Г.В. Навасельцава // Учен. зап. / Витеб. гос. ун-т. – 2011. – Т. 12. – С. 205–210.

10. Навасельцава, Г.В. Мастацкае ўвасабленне айчыннай гісторыі ў творах канца XX стагоддзя / Г.В. Навасельцава // Полымя. – 2012. – № 2. – С. 112–118.

11. Новосельцева, А.В. Художественное осмысление прошлого в прозе Вацлава Ластовского и Владимира Короткевича / А.В. Новосельцева // Мова і культура. – Вып. 10. – Т. VIII (108). – 2008. – С. 177–183.

12. Новосельцева, А.В. Репрезентация исторического прошлого в белорусской прозе начала XX века / А.В. Новосельцева // Мова і культура. – Вып. 11. – Т. X (122). – 2009. – С. 236–241.

13. Новосельцева, А.В. Темпоральная организация романов «Диво» Павла Загребельного и «Черный замок Ольшанский» Владимира Короткевича / А.В. Новосельцева // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. – 2010. – № 3. – С. 60–64.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

14. Навасельцава, Г.В. Вобраз Маці-Радзімы ў творчасці Адама Міцкевіча і Яна Баршчэўскага / Г.В. Навасельцава // Acta Albaruthenica : навук. зб. / Беларус. рэсп. фонд фундамент. даслед., ГА «Міжнар. асацыяцыя беларусістаў», Беларус. дзярж. ун-т, Польскі ін-т у Мінску ; пад агульн. рэд. М. Хаўстовіча, А. Баршчэўскага, С. Запрудскага. – Мінск, 2005. – Вып. 5. – С. 90–94.

15. Новосельцева, А.В. Образ майората у Э.Т.А. Гофмана и В. Короткевича / А.В. Новосельцева // Проблемы истории литературы : сб. ст. / Ин-т славяноведения РАН, Моск. гос. откр. пед. ун-т, Полоцк. гос. ун-т ; редкол.: А.А. Гугнин (отв. ред.) [и др.]. – М.-Новополоцк, 2006. – Вып. 19. – С. 377–379.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

16. Навасельцава, Г.В. Міфалагічныя рысы «арфічных» вобразаў у апавяданнях Вацлава Ластоўскага і Максіма Гарэцкага / Г.В. Навасельцава // Содружество наук. Барановичи-2005 : материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г. : в 2 ч. / Бар. гос. ун-т ; редкол.: В.И. Кочурко (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2005. – Ч. 2. – С. 219–221.

17. Навасельцава, Г.В. Сімвалічны вобраз Волата як мастацкі феномен выяўлення патрыятычнай думкі пісьменніка / Г.В. Навасельцава // Социально-психологические и гуманитарные аспекты интеграции культур в условиях трансформации современного общества : материалы междунар. науч.-практ. конф. студентов и молодых ученых, Витебск, 10 ноября 2005 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.П. Орлова (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2005. – С. 64–65.

18. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» / Г.В. Навасельцава // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья : материалы междунар. науч.-теор. конф., Витебск, 19–20 апреля 2007 г. : в 2 ч. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2007. – Ч. 2. – С. 402–403.

19. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў прозе Максіма Гарэцкага / Г.В. Навасельцава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія і іх

грамадска-культурнае і навукова-творчае асяроддзе : XV Гарэцкія чытанні : матэрыялы чытанняў, Мінск, 7 чэрвеня 2007 г. / Дзярж. музей гіст. бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Ін-т літаратуры НАН Беларусі, Ін-т геахіміі і геафізікі НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 88–93.

20. Навасельцава, Г.В. Мастацкае асэнсаванне мінулага ў творчай спадчыне Яна Баршчэўскага і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча / Г.В. Навасельцава // Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у еўрапейскім кантэксце : матэрыялы Міжнар. навук-практ. канф., прысвечанай 200-годдзю Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Мінск, 5–6 лютага 2008 г. / Ін-т мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: В.А. Максімовіч (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 208–213.

21. Навасельцава, Г.В. Мастацкі гістарызм у прозе Вацлава Ластоўскага і Максіма Гарэцкага / Г.В. Навасельцава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія : жыццё і творчасць : XVI Гарэцкіх чытанняў : матэрыялы чытанняў : (да 115-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага), Мінск, 15 лютага 2008 г. / Дзярж. музей гіст. бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Ін-т мовы і літаратуры НАН Беларусі, Ін-т геахіміі і геафізікі НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 116–120.

22. Навасельцава, Г.В. Мастацкае адчуванне часу ў прозе Максіма Гарэцкага і Уладзіміра Караткевіча / Г.В. Навасельцава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : XVII Гарэцкія чытанні : матэрыялы чытанняў : Мінск, 9 красавіка 2009 г. / Дзярж. музей гіст. бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Ін-т літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – С. 154–159.

23. Навасельцава, Г.В. Славянская проза пра мінулае ў тыпалагічных сыходжаннях: Ян Баршчэўскі і Карэл Ярамір Эрбен / Г.В. Навасельцава // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 21–22 кастр. 2010 г. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г.А. Арцямёнак, В.І. Русілка (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2010. – С. 194–197.

24. Навасельцава, Г.В. Хрысціянская інтэрпрэтацыя гісторыі ў кнізе «Шляхціц Завальня…» Яна Баршчэўскага / Г.В. Навасельцава // VII рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы рэсп. навук. канф., Брэст, 15 снежня 2009 г. / Брэсц. дзярж. ун-т : в 2 ч. ; пад агул. рэд. А.С. Кавалюк. – Брэст, 2010. – Ч. 1. – С. 137–141.

25. Навасельцава, Г.В. Хрысціянскія матывы ў прозе Яна Баршчэўскага і Уладзіміра Караткевіча / Г.В. Навасельцава // Творчасць Івана Навуменкі : славянскі, еўрапейскі, сусветны кантэкст : матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (да 85-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка

Беларусі акадэміка І.Я. Навуменкі), Мінск, 16 лют. 2010 г. / Ін-т мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: С.С. Лаўшук (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 344–349.

26. Новосельцева, А.В. Художественное осмысление прошлого в прозе Владимира Короткевича и Павло Загребельного / А.В. Новосельцева // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XV (62) Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, посвященной 100-летию со дня основания УО «ВГУ им. П.М. Машерова», Витебск, 3–5 марта 2010 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: А.П. Солодков (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2010. – С. 182–183.

## РЭЗЮМЭ

**Навасельцава Ганна Віктараўна**

**Мастацкая інтэрпрэтацыя гісторыі**
**ў творчасці беларускіх празаікаў XX стагоддзя**

**Ключавыя словы:** інтэрпрэтацыя, мастацкі гістарызм, суб'ектная арганізацыя твора, жанр, стыль, мастацкі вымысел, гістарычны факт, беларуская проза XX стагоддзя.

**Мэта** дысертацыйнай працы – выявіць праз шматаспектны аналіз спецыфіку мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў творчасці беларускіх празаікаў XX стагоддзя.

**Метады даследавання** – культурна-гістарычны, структурна-тыпалагічны, герменеўтычны, фенаменалагічны.

**Навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве праведзена канцэптуальна-сістэмнае асэнсаванне мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі беларускімі празаікамі XX стагоддзя. У працы вызначаны і ахарактарызаваны суб'ектыўна-творчы, аб'ектыўна-творчы, дакументальна-творчы падыходы да ўзнаўлення гістарычнага мінулага, вылучаны сацыякультурныя фактары, якія абумовілі спецыфіку мастацкага ўвасаблення айчыннага мінулага празаікамі XX стагоддзя; выяўлены генезіс мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі, удакладнены перыяды станаўлення і развіцця мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі, устаноўлены атрыбутыўныя рысы інтэрпрэтацыі гісторыі беларускімі празаікамі XX стагоддзя.

Матэрыялы і вывады працы з'яўляюцца актуальнымі і значнымі для далейшага вывучэння спецыфікі мастацкай інтэрпрэтацыі гісторыі ў беларускай прозе, для паглыбленага даследавання літаратуры ў шырокім сацыякультурным кантэксце, пры выкладанні лекцыйных і спецыяльных курсаў па гісторыі беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў, уводзінах у літаратуразнаўства, тэорыі літаратуры, гісторыі Беларусі; для распрацоўкі вучэбных дапаможнікаў па літаратуразнаўчых дысцыплінах для вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў; пры выданні энцыклапедычных і краязнаўчых даведнікаў; для працы гістарычных, краязнаўчых, літаратурных музеяў, для папулярызацыі беларускай літаратуры і культуры ў сродках масавай інфармацыі.

# РЕЗЮМЕ

**Новосельцева Анна Викторовна**

**Художественная интерпретация истории в творчестве белорусских прозаиков XX века**

**Ключевые слова:** интерпретация, художественный историзм, субъектная организация произведения, жанр, стиль, художественный вымысел, исторический факт, белорусская проза XX века.

**Цель** диссертационной работы – определить путём многоаспектного анализа специфику художественной интерпретации истории в творчестве белорусских прозаиков XX века.

**Методы исследования** – культурно-исторический, структурно-типологический, герменевтический, феноменологический.

**Научная новизна и практическая значимость полученных результатов.** Впервые в отечественном литературоведении проведено концептуально-системное осмысление художественной интерпретации истории белорусскими прозаиками XX века. В работе установлены и охарактеризованы субъективно-творческий, объективно-творческий, документально-творческий авторские подходы к воссозданию исторического прошлого, выделены социокультурные факторы, обусловившие специфику художественного воплощения отечественного прошлого прозаиками XX века; выявлен генезис художественной интерпретации истории, уточнены периоды становления и развития художественной интерпретации истории, определены атрибутивные черты художественной интерпретации истории белорусскими прозаиками XX века.

Материалы и выводы работы являются актуальными и важными для дальнейшего изучения специфики художественной интерпретации истории в белорусской прозе, углубленного исследования литературы в широком социокультурном контексте; для преподавания лекционных и специальных курсов по истории белорусского литературы XIX–XX веков, введению в литературоведение, теории литературы, истории Беларуси; для разработки учебных пособий по литературоведческих дисциплинам для высших и средних учебных заведений; при издании энциклопедических и краеведческих справочников; для работы исторических, краеведческих, литературных музеев; для популяризации белорусской литературы и культуры в средствах массовой информации.

## SUMMARY

**Navaseltsava Hanna**

**Artistic interpretation of history in the Belarusian writers' work of the 20th century**

**Key words:** interpretation, art historicism, subject organization of work, genre, style, fiction, historical fact, the Belarusian prose of the 20th century.

**The aim** of the thesis is to determine the specific character of artistic interpretation of history in the Belarusian writers' work of the 20th century by means of a multidimensional analysis.

**Research methods** are cultural, historical, structural and typological hermeneutic, phenomenological.

**Scientific novelty and practical significance of the results.** For the first time in the national literary conceptual systematic study of artistic interpretation of the history of Belarusian prose writers of the twentieth century has been held. The paper establishes and describes an author's subjective creative, objective and creative, objective and documentary approaches to restoration of the historic past and socio-cultural factors of the twentieth century are identified, which determined the specific character by Russian prose writers' incarnation of the past; the genesis of artistic interpretation of history is revealed, period of formation and development of the artistic interpretation of history are defined, the attributive features of history interpretation of Belarusian prose writers of the twentieth century are singled out.

Materials and deductions of the work are relevant and important for further examine of the specific character of the interpretation of history in the development of manuals on literary subjects for higher and secondary education institutions, for the publication of encyclopedias and reference books of local history, for history, local history, literary museums, promotion of Belarusian literature and culture in Belarusian prose, in-depth study of literature in a broad social context, delivering lectures and special courses on the history of Belarusian literature of 19th – 20th centuries, the introduction to literature, literary theory, the history of Belarus, for the media.